Уладзімір Гайдук

# Ракіта

Выдавецтва ГП БГКТ

Беласток 1971

Уладзімір Гайдук нарадзіўся 7 верасня 1941 года ў вёсцы Тарнопаль, Гайнаўскага павета, у сялянскай сям'і. Працуе на гаспадарцы.

Вершы У. Гайдука друкаваліся ў «Ніве», у літаратурных альманахах і іншых выданнях ГП БГКТ.

*Мастак*
**Стэфан Рыбі**

Фота
**Раман Сянько**

* * *

Крылы не толькі даны арлу,
Мае іх вецер і казка.
І тая думка, што паліць сум
І дарыць шчасце.

* * *

Такой хвіліне сэрца аддаю,
Што вечна будзе свежай на паперы
А словы, бы на камені разьбу,
Ні бура, ні агонь не пераменіць.

Сваім павабам, шчырасцю сваёй,
І радасцю, і горкімі слязамі, —
Будзеш хвіліна простай і жывой,
Ператрываеш цэлымі вякамі.

## НЕ ТАК ПРОСТА

Не так проста адкрываць сезамы сэрц,
Не так проста пазнаваць жыццё людское,
Еіе так проста разгадаць істотны сэнс:
Што ў жыцці вялікае, а што малое.

Не так проста падзяліцца і дабром і злом,
Не так проста адшукаць сяброў сардэчных,
Не так проста не паверыць у свой лёс,
Калі гора гарой зваліцца на плечы.

## РАКІТА

Я іду нарэзаць ракіты,
Хачу кошык у хаце сплясці.
А на лузе снег дымам клубіцца,
Вецер мчыць на мяцельным кані.

Зарасняк агалелы сутулен
Грае сумную песню зімы.
І сарочын домік пустуе
На кудравай вяршыне лазы.

Паміж чорных кустоў крушыны,
Дзе пасохла трава і ваўчкі,
Чырванеюць аднагадовыя
Ракіты пругкія дубцы.

Толькі я стаю ў задуменні
І сцізорык застыў у руках.
Сарваў вецер лісцё-адзенне,
Я цяпер вас пазбаўлю жыцця.

Горка доля чорнай ракіты,
Пні пакажуць карэння след.
А вяскою сок стрэліць лісцем,
Многа пасынкаў нарасце.

## ВЕТРЫК

Ветрык-пястун
Лістамі шапоча,
Ветрык-шалун
Гуляці хоча.

З быстрай крыніцай,
З птушкамі ў лесе,
Ноччу з зарніцай,
З саломай ў стрэсе.

## ВЯСНА

Панярслося рэха,
Зямлю ўскалыхнула.
Ідзе вясна з уцехай —
Моц сваю пачула.

Загадала сонцу
Ззяці шчодрай ласкай,
Бліснула ў аконцах
Праменістай казкай.

Ветрыкам навесным
Ўпала на паляны,
Заспявала песню
На лад нечуваны.

Зялёнай травіцай
Прыбрала даліны,
Пацякла вадзіцай
У долы, лагчыны.

Паімчала к лесу,
Бы малодка тая,
І сіняй пралескай
Важна расцвітае.

Гэй, красуй шчасліва,
Вяска маладая.
Прыгажэй на дзіва,
Будзь вечна жызая.

## АДУВАНЧЫК

Усё праміннае, усё канец мае свой,
Хоць сэрца хоча, каб было інакшай.
Знікаюць успаміны, быццам сон…
У руцэ застыў, адцвіўшы, адуванчык.

І толькі дзьмухнуць, паляцяць ад нас
Пушынкі матылёчкамі жаданняў.
Ды зноў вярнулася вясна —
І адуванчык ў расцвітанні.

Не той, што цвіў, й другая ўжо рука
Трымае кветку-сонейка малое.
І тулімся да новага цяпла,
Якога нам ніколі не даволі.

## РАНКАМ

На лясы, на луг шырокі
Сонца падаюць прамені,
А дзяўчынка сінявока
Ловіць «Зайчыка» у жмені.

Замігцелі, як жывыя,
Пасярэбраныя росы,
А дзяўчынка боткі шые,
Каб не змерзла лялька боса.

## ДАЖЫНКІ

Жыта выжата,
І над пожняю
Разагнуліся
Жнеі гожыя.

І паставілі
Перапёлачку.
Праспявалі мы
Ясну долечку.

— Ой, вылець, вылець,
Перапёлачка,
Жытка выжата
З свайго полечка.

Плён, высокі плён, —
Песня чуецца, —
У наш вольны дом,
Што будуецца.

Песня спетая,
Чарка выпіта,
Песня гэтая
Незабытая.

## РОДНЫЯ ПЕСНІ

Ой вы, думкі-песенькі
З роднае старонкі.
Ой вы, песні сумныя,
Ой вы, песні звонкі.

Хто стварыў вас, песенькі,
Дык не трудна знаці.
Людзі вас стварылі,
Праца — ваша маці.

Чар ваш просты, шчыры
За сэрца кранае.
Той вас не палюбіць,
Хто жыцця не знае.

## ЗАХАД СОНЦА

Знізілася сонца й колерам чырвоным
Аблівае хмары і бору кароны.
Гіраменнямі сыпле, як дзяўчына смехам,
Зямлю абнімае, якая ж уцеха!
І прамень апошні людзям пасылае.
І, як бы стыдалася, за горы ўцякае.
Вернешся ты, сонца, заўтрашнім дзянёчкам,
Стрэнем цябе, сонца, песняй-васілёчкам.

## КОШЫК

Панясу на дарог прагаліны
Поўны кошык, прапахлы лесам.
Грыбы баравыя, паджарыя
Сваім выглядам дзяцей цешаць.

Кожны грыб у казку мяняецца,
Толькі слухаць і ўголас марыць,
Гараць вочы, жар разгараецца.
Грыб і казка ходзяць у пары.

І таму ў час вячэрніх мяцеліц,
Як пасядзем ля цёплай печы,
Казкі з кошыка нам грыбы дзеляць —
Ах, як добра ў хаце, здаецца.

## МАЦІ

Шызакрылай галубкай
Ты прыдзі хоць у сне,
Дарагімі рукамі
Абымі ты мяне.

З ціхай ласкай-замовай
Ад нядобрых людзей —
Прытулі, залатая,
Як калісь, да грудзей.

## ПАДАРУНАК ВОСЕНІ

Ты мне сёння лістоў пажаўцелых
Прынясла раніцой на ўспамін.
Разлажыўшы, на іх мы глядзелі,
Шкадавалі мы іх, залатых.
У гэтай хварбе і паху прэлым
Іх гаротны, няўмольны лёс.
Яны будуць зямельцы пасцеляй,
Яны будуць валяцца скрозь.
І ні разу яны не заплачуць,
Не папросяць: ратуй нас, ратуй...
Як гляджу на лісты, тады бачу
У іх адбітую долю сваю.
Дык няхай вас парывісты вецер
У сіняй далі пакіне ў расе.
Мяне цешыць жыццё на свеце.
Што купаецца ў сонца красе,
Што смяецца ў радасці шчырай,
Хоць і хмары закрыюць блакіт...
Дык ляціце, лісточкі, у вырай,
Маіх думак вы дружбакі.

## ЖАДАННІ

Дроў накалю.
Печ напалю
Увечар.

Прыдзе спакой,
Кране рукой
За плечы.

І павядзе
Думка мяне
Удалеч.

Я буду сніць
Цудоўны сны —
Жаданні.

Маё жыццё
Кароткім сном
Праходзіць.

Табе адной
Гэты радок
Валодзін.

**ПІСЬМО МАЦІ**

Як ты жывеш,
Матуля дарагая?
З тугой на сэрцы,
У чаканні горкім,
Перад іконай
Рукі ў крыж складаеш
І просіш Бога,
Каб прыйшоў сын з войска.,,

Цябе жыццё
Не ласкала ніколі
Праменнем-ластаўкай,
Ні пірагом пшанічным;
Аржаны хлеб
Пасыпала ты соллю,
Толькі лустой
Няма з кім падзяліцца.

А за акном
Гарыць пажарам восень,
І журавы
Ключом ляцяць на захад,
А ў хаце пуста,
Ні сябра, ні госця,
І вецер
Вые голасам сабачым.

Знаю,
Хацела б ты жыцця другога.
Каб дом быў новы,
Цёплы і шчаслівы...
Каб казкі баяць
Для ўнучка малога,
З нявесткай жыць
Так, як з дачкой праўдзівай...

На ўсё ты гэта,
Мама, заслужыла,
Ды лёс не дорыць
Бедным сваёй ласкі.
Мо смутак твой і свой
Пяром я змыю,
Хоць на паэта славу
Я не ласы.

І так гаруй
Да восені другое.
Ніхто табе
Добрым слаўцом не кіне.
А ты бяду сваю
Странеш слязого,
Перад іконаю
Чакаючы на сына.

Хоць я прыду
У хату без падаркаў
І твае рукі
Толькі пацалую,

Ты на стале
Паставіш поўну чарку,
За долю вып'ем
Добрую і злую…

А за акном
Гарыць пажарам восень.
І журавы
Ключом ляцяць на захад.
А ў хаце пуста,
Ні сябра, ні госця…
І вецер вые
Голасам сабачым.

**ЗІМА ІДЗЕ**

Асенні час
Прыйшоў да нас,
І дождж,
І вецер
Ён прыгнаў.
Шпакі грамадкай
Усё крычаць:
— Ідзе зіма!
— Ідзе зіма!

Зіму сустрэць,
То трэба мець
І хлеб,
І сена
На запас.
Трэба у поле
Выйсці ўсім —
Бульбу капаць,
Бульбу капаць!

Жаўціцца гай,
Лісцё дрыжыць,
А павуцінне
У свет ляціць.
Яно нам кажа,
Што пара
Ўжо жыта сеяць
На палях.
І калі рунь зямлю акрые,
Нястрашны вецер ёй, што вые.

* * *

Для душы ёсць дом умоўны:
Гай і лес, поле і луг.
У кожнай дробінцы прыроды
Засакрэчан нейкі ключ.

Узорных красак-летуценняў
У вянок мне не сабраць.
Спіць, убаюканая снегам,
Белавежская вясна.

Ёй чаромхавая квецень
Сніцца ціхаю парой,
І раздолле з звонкім смехам,
І з напевам салаўёў.

## ЗМЕСТ


Крылы не толькі даны арлу
Такой хвіліне сэрца аддаю
Не так проста
Ракіта
Ветрык
Вясна
Адуванчык
Ранкам
Дажынкі
Родныя песні
Захад сонца
Кошык
Маці
Падарунак восені
Жаданні
Пісьмо маці
Зіма ідзе



© OCR: Камунікат.org, 2010 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2010 год
© PDF: Камунікат.org, 2010 год